2 **Мещеряков, Б.** Большой психологический словарь / Б. Мещеряков. – СПб. : Прайм-ЕВРОЗНАК, 2004. – 672 с.

3 **Пергаменщик, Л. А.** Кризисная психология : учеб. пособие / Л. А. Пергаменщик. – Минск : Выш. шк., 2004. – 288 с.

4 Посттравматический синдром у ветеранов ВОВ [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://users.livejournal.com/-zmei/217789. – Дата доступа : 25.03.2019.

5 **Терехова, Т. А.** Влияние боевого стресса на состояние психического здоровья участников военных действий / Т. А. Терехова, Н. С. Фонталова // Психология в экономике и управлении [Электронный ресурс]. – 2014. – № 4. – Режим доступа : https://cyberleninka.ru/article/n/vliyanie-boevogo-stressa-na-sostoyanie-psihicheskogo-zdorovya-uchastnikov-voennyh-deystviy. – Дата доступа : 25.03.2019.

УДК 821.161.3

# «Я ПРАЗ ГОРА І СМЕРЦЬ ПРЫЙДУ ДА ЦЯБЕ…»
(Мікола Сурначоў)

*В. В. КУРЛОВІЧ*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту, г. Гомель*
*А. І. РАГУЗАВА*
*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны*

Па беларускай зямлі праходзілася не адна ваенная навала, пасля якой заставаліся папялішчы і руіны, а людскія сэрцы захавалі гора і пакуты. Аднак менавіта Другая сусветная вайна пакінула крывава-трагедыйны след у гісторыі нашага народа, забраўшы мільёны чалавечых душ. Невымернай трагедыяй з’яўляецца смерць чалавека, бо разам з ім гіне цэлы свет.

Ваенны час не абмінуў і творчую інтэлегенцыю. Апраналі вайсковыя шынялі і літаратары, штодня яны глядзелі смерці ў вочы і многія з іх аддалі жыццё за Радзіму. Адным з іх быў Мікола Сурначоў, што нарадзіўся на Рагачоўшчыне ў 1917 годзе. Малады паэт скончыў літаратурны факультэт Гомельскага педінстытута, працаваў у рэдакцыі газет “Звязда” і “Чырвоная змена”. Змяніць пяро журналіста на чырвонаармейскую вінтоўку паэта прымусіла Айчынная вайна. Усе напісанае Сурначовым на вайне сабрана ў зборнік “Акопны спеў”, пранікнёныя радкі якога нараджаліся ў суровых франтавых умовах. Ужо ў чэрвеньскія дні 1941 года ўзнік твор, што ўвайшоў у анталогію беларускай паэзіі:

Ніколі не ехаць
Хлапцу маладому
Да роднага гаю
Да блізкага дому…
Ляжыць ён, як віцязь,

У стоптаным жыце.
Маці спаткаеце –
Ёй не кажыце…
“У стоптаным жыце”

Жыта, стоптанае, змарнаванае, – вечны сімвал жыцця. Абарваны лёс чалавека, як нявыспелы колас, на гэтым абсягу набывае асобую трагедыйнасць. Побач з родным домам ад варожай кулі загінуў малады салдат. Вайна ёсць вайна, такі лёс можа сустрэць кожнага. Верш, напісаны ў самым пекле вайны, нясе боль і смутак па тых, хто загінуў.

Паэзія Вялікай Айчыннай вайны сцвярджае высокія ідэалы нашага народа. Падзеі першых месяцаў вайны выклікалі жаданне дапамагчы свайму народу захаваць баявы дух і патрыятычныя пачуцці.

Паэт знішчае ворага салдацкай зброяй і сілай мастацкага слова. Яго палымяныя вершы напоўнены нянавісцю да фашыстаў і заклікаюць да бязлітаснай помсты захопнікам. Як прысуд, як непазбежны лёс гучыць рэфрэн, які вар’іруецца і пасля апошняй страфы чытаецца:

Я табе спакою, гад, не дам, –
Кроўю сэрца ты адкажаш нам!
“Слова помсты”

Вершы М. Сурначова аб баявых буднях, аб каханні і смерці маюць жыццясцвярджальны настрой, што надае ім свежасць і прастату ўспрыняцця. У многіх радках адчуваецца пякучы подых вайны:

Паглядзі, па-над Волгаю дым.
Гарматнымі громамі поўніцца неба,
І бомбы равуць над акопам маім.
“Прысяга ў акопах”

У пару выпрабаванняў абвастраецца любоў да Радзімы, што мае патрэбу ў абароне, і нараджаецца нянавісць да захопнікаў. Прыкметна лакалізуецца пачуццё Радзімы – паэты славяць менавіта свой “ родны кут”:

І толькі б дзе ні ваяваў,
Дзе б ні быў у траншэі ,
Такіх, як на радзіме, траў,
Такіх густых завеяў,
Такіх світанняў і крыніц,
Крутых віроў, палонак,
Такіх, як наша, зараніц,
Як на Сажы сасонак, –
Я не знайшоў, як ні хацеў
Знайсці ў другой мясціне.
І доўга мой акопны спеў
Журыўся па Айчыне.

“І толькі б дзе ні ваяваў…”

Думкі паэта часта выказваюцца ў дэкларатыўнай форме. Яго словы хвалююць сваёй эмацыянальнай адпаведнасцю трагічнаму часу і лёсу Беларусі. Такая разамкнутасць у рэчаіснасці – характэрная рыса літаратуры ваеннай пары. Паэты адчувалі сябе ў адкрытым часе. Былыя слава і моц роднай зямлі натхняла іх на такія радкі:

Ой, нялёгак шлях салдата!
Ўспамяніце ж вы, з якімі мы не бачымся гадамі,
Нас хоць снамі залатымі,
Ўспамяніце і сваімі
Дакраніцеся губамі.

“Ой, нялёгак шлях салдата…”

Суровы ваенны час кладзе свой адбітак на паэтыку яго радкоў. Стан салдата пасля цяжкіх баёў і атак паказаны проста і праўдзіва. Многія крытыкі адзначаюць, што вершы Сурначова прываблiваюць арыгінальнасцю думак і неўвядальнасцю пачуццяў. Дабрынёй, спагадлівасцю і пяшчотай кранае верш ”Ліст да маці”, дзе мы чытаем радкі:

Ля хаціны тваёй сасновай
Скрозь байцы ў шынялях, бушлатах.
Маці!
Стрэнь іх там добрым словам,
Пачастуй, чым наш край багаты.

Радкі вершаў Сурначова прыцягваюць сардэчнай замілаванасцю, смуткам. Паэта пранізвае пачуццё вінаватасці перад роднай староной, якую ён, чалавек са зброяй, не можа абараніць, і тады нараджаюцца вельмі праўдзівыя і шчырыя словы:

Старонка мая, у смутку
Ты сына свайго не кляні!
Мне ў кожным лясным закутку
Сняцца твае кляны.

“Старонка мая, у смутку…”

Паэт ні на адзін дзень не развітваўся з паэзіяй, ён заўсёды знаходзіў, каб папрацаваць над вершамі, пазначыўшы, дзе і калі яны былі напісаны. Не дзіўна, што самі вершы паэта – гэта споведзь, шчырая і ўсхваляваная. Паэтычнае слова Сурначова, выпрабаванае вайной, захавала народныя традыцыі, у ім няма неахайнасцей, выпадковых слоў. Сярод выбухаў кананады гучала прысяга паэта на вернасць Радзіме і народу:

Я губы ад гневу шалёнага сцяў
І сэрцам, Радзіма, табе прысягаю.
У стэпе палынным,
У небе крылатым
Мы будзем знішчаць іх няшчадней і злей.

“Прысяга ў акопах”

Лірычны герой Сурначова ведае, што шлях да перамогі доўгі і цяжкі, напоўнены выпрабаваннямі, але ён верыць ў непермаможнасць савецкага народа, што добра адчуваецца ў вершы “Чырвоная зорка”:

Услаўце ж зорку, зорку вызвалення!
Бо доўга-доўга будзе зорка гэта
Ісці па заняволенаму свету,
Дзе зорка гляне – там зардзее ранне.

Мікола Сурначоў загінуў у апошнія дні вайны, на самых подступах да Берліна.

“Жывіце дружна” – гэтыя словы часта сустракаюцца ў апошніх пісьмах Сурначова, якія паэт пісаў сваім родным незадоўга да таго як загінуў.

Вайна забрала таленавітага паэта, але засталіся яго вершы, поўныя любві да Радзімы, жыцця і нянавісці да ворага. Песня маладога паэта жыве і будзе доўга хваляваць нашы сэрцы сваёй шчырасцю і мужнасцю.

УДК 94(100) «1939/45»:821.161.3

## ОБ ОТРАЖЕНИИ ТЕМЫ «ЧЕЛОВЕК И ВОЙНА» В ЛИТЕРАТУРЕ И КИНЕМАТОГРАФЕ

*А. А. САМОЙЛЕНКО*
*Белорусский государственный университет транспорта, г. Гомель*

«Не надо войны, не надо. Давайте-ка лучше работать, мыслить, искать. Единственная настоящая слава – слава труда. Война – удел варваров».

*Ги де Мопассан*

Для нас имеет огромное значение, есть ли в нашей жизни смысл. Каждый желает максимально себя проявить. Но лучше всего личность человека проявляется в критических ситуациях, например, таких, как стихийные бедствия или войны.

Война – событие, противное для человеческого разума. Сколько тоски, боли и горечи несёт она в себе. Ничего в нашем мире не проходит незаметно. Даже спустя многие годы война оставляет в памяти людей ужасные картины: разруху, голод и смерть. Эти ужасающие воспоминания навсегда оставили шрамы на сердцах людей.

В чём смысл войны? За что и по сей день воюют люди? Эти два вопроса волнуют человека уже не одно столетие. Каждый из нас видит войну по-своему: для кого-то это способ обогащения, а для кого-то – единственный способ обеспечения своего мирного существования.